Вучням раздаюцца карткі з заданнем:

| |
|---|
| 1) Усяго добрага, да сустрэчы, бывайце здаровы, _________________. |
| 2) Добрай раніцы, прывітанне, добры вечар, ________________. |

— Дапоўніце кожны радок ветлівых слоў уласным прыкладам. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі арганізоўваецца франтальная праверка.)

Практыкаванне 153.

Вучні ўтвараюць форму першай асобы множнага ліку дзеясловаў II спражэння на ўзор, выдзяляюць канчаткі дзеясловаў. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на канчаткі, якія пішуцца ў дзеясловах з асновай на мяккі (цвёрды і зацвярдзелы) зычны.

Практыкаванне 154.

Вучні малююць у сшытку схему, прапанаваную ў практыкаванні, дапаўняюць яе патрэбнымі канчаткамі.

Практыкаванне 155.

Вучні дапаўняюць прыказку дзеясловам у форме 1-й асобы множнага ліку, тлумачаць выбар канчатка. Тлумачыцца сэнс прыказкі: *увосень людзі збіраюць багаты ўраджай, таму ў іх заўсёды ёсць чым пачаставаць гасцей.* Арганізоўваецца пісьмо па памяці. Звяртаецца ўвага на колькасць слоў у прыказцы, на тое, што слова *ўвосень (значыць восенню)* пішацца разам.

**IV. Інфармаванне аб дамашнім заданні, інструктаж па яго выкананні.**

Дамашняе заданне. Практ. 156.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць верш і паставіць дзеясловы ў дужках у форму 1-й асобы множнага ліку. Акрамя таго, трэба будзе выдзеліць канчаткі дзеясловаў, форму якіх змянілі, і вызначыць іх тып спражэння.

**V. Вынік урока.**

— Звярніцеся да табліц у сшытку і адкажыце, якія канчаткі маюць дзеясловы I спражэння ў форме першай асобы множнага ліку. Якія з гэтых канчаткаў пішуцца пад націскам (не пад націскам)? Якія канчаткі маюць дзеясловы II спражэння ў форме першай асобы множнага ліку? Калі пішацца канчатак *-ім* (*-ым*)?

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Виктория Апанасенок ПОСТ № 1: Вахта памяти [Электронный ресурс] / Апанасенок Виктория // 7 дней. — Режим доступа: https://7dney.by/ru/issues?art_id=6039. — Дата доступа: 17.02.2019.
2. Крынічка: Чытанка : для дашк. і мал. шк. узросту / укл. Р. М. Міронава; маст. Т. П. Беразенская. — Мінск : Маст. літ., 2009. — 167 с.
3. Народныя прыметы пра надвор'е [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.gorybalka.com/by/narodnye_primety_o_pogode.html. — Дата доступу: 13.02.2019.

**Крыніцы ілюстрацый:** https://www.google.com/url?sa=i&source=images&cd=&cad=rja&uact=8&ved=2ahUKEwjFz9Lgi__gAhVQDOwKHXYsA_YQjRx6BAgBEAU&url=https%3A%2F%2Flifter.com.ua%2Fvot-6-uprazhneniy-chtoby-pokonchit-s-bolyu-v-nogah-kolenyah-i-bedrah-4835&psig=AOvVaw2Qjk3KX4iAV7W94zyP1qsC&ust=1552565550365595; http://gostinaya.net/pics/g-u.jpg; https://png.pngtree.com/element_origin_min_pic/16/12/15/98578d4368f126f8410de71e842fee14.jpg.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук*
*дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ*

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## II клас*

### *Мяккі*

*1. Разгадайце рэбус і запішыце слоўнікавае слова, якое ў вас атрымалася.*



*Пастаўце націск у запісаным слове.*

*2. Дапоўніце верш патрэбным словам.*

**Майстра «ь»**

Стаў я каля слова «кон» —
атрымаўся спрытны конь,
а прыліп да слова «рыс» —
засіпела хціва рысь.
«Я ў пашане, як мастак», —
казаў майстра _________ знак.

*Уладзімір Мацвеенка* [1, с. 41]

***Хціва** — прагна, рус. жадно.*
***Кон** — асобная партыя ў некаторых гульнях.*

*Вымаўленне якіх слоў у вершы адрозніваецца адным гукам? Якой літарай адрозніваюцца гэтыя словы?*

*3. Дапоўніце загадку патрэбным словам. «Рассыпаныя» літары злучыце так, каб атрымалася слова-адгадка.*

Нехта ціха, ________ ходзіць, [мяккі]
нехта зноў павейкі зводзіць. [мякка]
Сон чароўны прынясе. н ч
Як яе завуць усе? о

*Уладзімір Мацвеенка* [1, с. 21]

*4. Прачытайце акразагадку. Дапішыце прапушчаныя літары ў слова.*

**К**руглы кошык з мя__ім дном —
**О**т яе ўтульны дом.
**Ш**коды мышка не наробіць,
**К**алі ў хаце яна ходзіць.
**А**дгадайце, хто яна?

*Уладзімір Мацвеенка* [2]

*Звярніце ўвагу на выдзеленыя літары і назавіце слова-адгадку.*

*5. Прачытайце загадку. Дапоўніце яе слоўнікавым словам.*

*Злучыце «рассыпаныя» літары, каб атрымалася адгадка.*

У баравых мясцінах нізкіх, а в і
дзесь, можа, дальніх, можа, блізкіх, м
густы ды ________ мох такі, х к
што вырастуць ... . а і

*Соф'я Шах* [3, с. 80]

## *Цвёрды*

*1. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія. Запішыце слова, якое атрымалася.*

Ц А В А Ё А Р А Д А Ы

*Падзяліце запісанае слова рыскай (|) на склады.*

*2. Запішыце слоўнікавае слова, супрацьлеглае па значэнні да прапанаванага.*

мяккі — __________

*Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.*

1) Вавёрка раскусіла ______________ арэшак.
2) У вавёркі ______ пушысты хвост.

*3. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

[т] [ц]

[..]вёрды

*4. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 5 | 3 | 1 | 4 | 2 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| д | ё | ц | р | в | ы |

*У слоўнікавым слове падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.*

## *Мядзведзь*

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 3 | 2 | 1 | 4 | 7 | 6 | 5 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| д | я | м | з | д | е | в | з | ь |

*Пастаўце націск у слове. Запішыце слова, якое «схавалася» ў слоўнікавым слове.*

*2. Гульня «Лесвіца». «Спусціцеся» па лесвіцы і дапішыце патрэбныя словы. Зафарбуйце радок, у які ўпісана слоўнікавае слова.*

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| м | я | | | в | е | д | з | ь | | | | |
| м | | | | в | е | д | з | і | ц | а | | |
| м | я | | | в | е | | | е | в | ы | я | |
| м | е | | | в | | д | з | я | н | я | т | ы |

*Дапоўніце верш патрэбнымі словамі.*

**Дзякуй, тата**

Сталі дзеці хварэць.
Варыць лекі ______________:
Аднаму — чарнічак,
Другому — сунічак,
Трэцяму — чабарок,
І для кожнага — мядок.
Бегаюць ______________:
— Ты выдатны доктар, тата!

*Ніна Галіноўская* [4, с. 156]

***Чабарок*** *— травяністая духмяная расліна з дробнымі ружова-ліловымі ці белымі кветкамі.*

*3. Адгадайце загадку. Запішыце слова-адгадку.*

Мы засынаем да вясны,
мы бачым залатыя сны,
мы ўвесну не мінём калод,
мы вельмі, вельмі любім мёд.

*Уладзімір Мацвеенка* [1, с. 21]

***Не мінём калод*** *— не пройдзем каля калод (вуллёў).*

*4. Дапоўніце верш патрэбнымі словамі.*

Дзед __________ стаміўся троху —
лёг у ______________ бярлогу. [мядзведзь]
Смачна спалася яму, [мяккую]
не ўставаў усю зіму.

*Данута Бічэль-Загнетава* [5, с. 7]

*5. Прачытайце верш. Дапішыце прапушчаныя літары на месцы пропускаў.*

**Мячык**

Купілі мне мячык.
Прыйдзі паглядзець.
Ён скача, як зайчык,
А я — як мя__ведзь.

*Ніна Галіноўская* [4, с. 38]

*У слоўнікавым слове падкрэсліце літару, якая* [illegible]

*6. Прачытайце верш. Дапоўніце яго патрэбным слоўнікавым словам.*

**Першы снег**

— Што, малы, так горка плачаш?
— Выпаў снег, а я — не бачыў!
Падаў снег, а я — прагледзеў!
Не праспаў зіму я ледзьве...
— Твае беды, брат, не беды,
Не рабі ты з іх трагедый:
У зімовай пушчы недзе
Зараз спяць усе ___________...
— Але ж дзеці — не ___________,
Нам цікава ўсё на свеце!

*Алесь Пісьмянкоў* [6, с. 42]

*Раскажыце, чаму сумаваў хлопчык.*

### *Чацвер*

*1. Разблытайце «павуціну» і запішыце слоўнікавае словы.*




*Пастаўце націск у слове.*

*2. Дапішыце прапушчаныя назвы дзён тыдня.*

Панядзелак, аўторак, серада, _______, пятніца, субота, _______.

*Дапоўніце сказ патрэбным словам.*

_________ — чацвёрты дзень тыдня.

*3. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

а е т ц

ч.. ..вер

*4. Дапоўніце вобразны выраз слоўнікавым словам. Злучыце выраз з яго значэннем.*

**пасля дожджыку ў __________**

| невядома калі, ніколі | у чацвер вечарам |
|---|---|

*Дапоўніце размову дзяцей гэтым вобразным выразам. Які недахоп ёсць у Сяргея? Чаму дрэнна спазняцца?*

— Калі Сяргей перастане спазняцца на ўрокі? — злаваўся Пеця.

— _____ _______ __ _______. Ён заўсёды доўга збіраецца ў школу, — адказала сястра Сяргея.

*5. Прачытайце верш. Дапоўніце яго патрэбным словам.*

Сем дзён у тыдня,
Сем дзяцей,
Ты назаві іх
Сам хутчэй.
Панядзелак — адзін!
Аўторак — два!
Серада — тры!
________ — чатыры!
Пятніца — пяць!
Субота — шэсць!
Нядзеля — сем!
Запомні гэтыя імёны
І назаві, які дзень сёння.

*Міхась Пазнякоў* [7, с. 12]

*Пералічыце назвы дзён тыдня. Адкажыце на пытанне, змешчанае ў канцы верша.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Мацвеенка, У. І.* Займальны родны алфавіт : вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту / Уладзімір Мацвеенка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 48 с.
2. *Мацвеенка, У. І.* Сябрынка : вершы, загадкі, казкі : для малод. шк. узросту / У. І. Мацвеенка ; маст А. І. Гармаза. — Мінск : Юнацтва, 1995. — 127 с.
3. *Шах, С. М.* Вучым гаварыць і думаць : вучэб.-метад. дапаможнік для лагапедаў / С. М. Шах. — Мінск : Народная асвета, 1998. — 95 с.
4. *Галіноўская, Н. В.* Калі я шчаслівы : вершы, казкі, жарты, небыліцы : для дзяцей мал. шк. узросту / Н. В. Галіноўская. — Мінск : Звязда, 2013. —160 с.
5. *Бічэль-Загнетава, Д. І.* Гараднічанка : вершы / Д. І. Бічэль-Загнетава. — Мінск : Юнацтва, 1993. — 48 с.
6. *Пісьмянкоў, А.* Мы з братам : вершы, казкі : для дашк. узросту / А. Пісьмянкоў ; маст. С. Л. Рыжыкава. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 63 с.
7. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.

**Крыніцы ілюстрацый:** http://juicep.ru/wp-content/uploads/2017/08/4-13.png; https://static9.depositphotos.com/1642482/1149/i/450/depositphotos_11491547-stock-photo-kiwi-fruit.jpg.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*